Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева

# Барысаў – культурная сталіца

2021



Рашэннем калегіі
Міністэрства культуры статус
«Культурная сталіца года» ў 2021
годзе прысвоены гораду Барысаву.

Культурная сталіца Беларусі – штогадовая акцыя абрання таго ці іншага горада Беларусі культурным цэнтрам краіны з мэтай развіцця рэгіёнаў, актывізацыі мясцовай грамадскай ініцыятывы, прыцягнення ўвагі шырокай грамадскасці і замежных турыстаў да беларускай нацыянальнай культуры.

На працягу года культурную сталіцу
наведваюць прафесійныя
танцавальныя, музычныя,
харэаграфічныя калектывы,
актывізуецца дзейнасць
рэгіянальных устаноў культуры і
мясцовых уладаў.



Рэспубліканская акцыя «Культурная сталіца года» праводзіцца з 2010 г.
У кожным з гарадоў, якія былі абвешчаны культурнымі сталіцамі, рэалізуюцца інавацыйныя праекты па прэзентацыі культурнай самабытнасці гэтых гарадоў, развіццю і папулярызацыі традыцый і дасягненняў нацыянальнай культуры, актывізацыі творчай ініцыятывы, павышэнню турыстычнай прывабнасці рэгіёнаў.

ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева» падрыхтавала шмат праектаў, сярод якіх не апошняе месца займаюць традыцыйныя кніжныя і мастацкія выстаўкі.

# Культурныя сталіцы Беларусі



# Культурныя сталіцы Еўропы



# Культурныя сталіцы Садружнасці Незалежных Дзяржаў





# Заўсёды на нашай зямлі нараджаліся таленавітыя людзі, надзеленыя адметным дарам слова.

# У іх ліку і сучасныя выбітныя барысаўскія пісьменнікі.

# Ізі Харык



ХАРЫК Ізі [Ісак; псеўд. А. З. Зембін; 17.03.1898, паводле інш. звестак 06.03.1896, в. Зембін Барысаўскага раёна – 29.10.1937, Мінск] – паэт.

Бацька яго быў шавец-саматужнік, потым – ламавы рамезнік. Будучы паэт вучыўся ў Хедэрэ, потым у рускай народнай школе ў Зембіне. У юнацкія гады працаваў на фабрыках і заводах Мінска, Барысава, Гомеля. У 1917 пераехаў у Мінск на пастаяннае месца жыхарства. Быў бібліятэкарам, загадчыкам агульнаадукацыйнай школай. У 1921–1923 вучыўся ў Вышэйшым літаратурным інстытуце імя В. Брусава, у 1927 скончыў яўрэйскае аддзяленне педфака 2-га Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Пасля пераезду ў Мінск працаваў рэдактарам яўрэйскага часопіса «Штэрн» («Зорка»). У 1931 выбраны членам ЦВК БССР. Быў членам прэзідыума Саюзаў пісьменнікаў СССР і БССР. Літаратурную дзейнасць пачаў у 1920 у яўрэйскіх газетах (публікацыі не выяўлены). У 1922 у Мінску выдадзена яго першая кніга вершаў «Трапятанне». З 1925 друкаваўся ў часопісе «Штэрн». Пісаў на яўрэйскай мове (ідыш). У 1928 яго вершы ўпершыню з’явіліся ў перакладзе на беларускую мову ў часопісе «Маладняк». Да 1936 асобнымі выданнямі ў Мінску, Маскве і Кіеве выйшла больш за 10 кніг паэта на ідыш. У 1937 яго рэпрэсавалі: 11.09.1937 ён быў арыштаваны, а 29.10.1937 – расстраляны. Рэабілітаваны 13.06.1956. У 1958 і 1969 асобнымі кнігамі ў перакладзе на беларускую мову выдадзены выбраныя творы І. Харыка. Да стагоддзя з дня нараджэння паэта выдадзены зборнік вершаў і паэм «Отсель кричу в грядущие года…»

Член СП Беларусі з 1934. Член-карэспандэнт АН Беларусі.

# Міхась Клімковіч



КЛІМКОВІЧ Міхась [08(20).11.1899, в. Сялітранкі Барысаўскага раёна – 05.11.1954, Мінск] – паэт, драматург, празаік, крытык.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. У 1915 скончыў Барысаўскае вышэйшае чатырохкласнае гарадское вучылішча і здаў экстэрнам экзамен на званне народнага настаўніка. У 1915–1921 настаўнічаў у вёсках на Барысаўшчыне. У 1916 ён сутыкнуўся з сацыял-дэмакратамі і пазнаёміўся з падпольнай літаратурай. У 1920 уступіў у камуністычную партыю. У 1921–1923 служыў у Чырвонай Арміі, потым настаўнічаў на Лагойшчыне, займаўся партыйнай дзейнасцю. З 1929 – загадчык культаддзела Цэнтральнага савета прафсаюзаў БССР. У 1932–1934 быў старшынёй аргкамітэта, а ў 1934–1939 – старшынёй праўлення СП БССР. У 1943 быў партызанам у атрадзе «За Радзіму», адкуль неўзабаве выляцеў самалётам у Маскву, дзе да 1947 быў галоўным рэдактарам Дзяржаўнага выдавецтва ў Маскве, потым у Мінску. У 1947–1954 працаваў літкансультантам СП БССР, адначасова ўзначальваў камісію па рабоце з маладымі аўтарамі. Рана пачаў пісаць вершы, яшчэ у час навучання ў вучылішчы, але яны не захаваліся. У 1929 у альманаху «Ранне» надрукавана паэма «Чатырнаццаць слуцкіх» і нізка вершаў. З гэтага часу і пачалася яго сур'ёзная літаратурная дзейнасць. З'явіўся шэраг артыкулаў аб становішчы і задачах беларускай літаратуры. З прозы вядомы адзін яго зборнік «Лясное возера» (1946). Актыўна працаваў у жанры празаічнай драмы, опернай і балетнай драматургіі. Перакладаў на беларускую мову творы Л. Талстога, А. Чэхава, І. Крылова, Т. Шаўчэнкі, П. Тычыны, літоўскіх і польскіх пісьменнікаў, пісаў гісторыю беларускага тэатра.

Член СП Беларусі з 1932. Аўтар тэксту гімна БССР. Словы М. Клімковіча ляглі ў аснову Дзяржаўнага гімна Беларусі.

# Васіль Барысенка



БАРЫСЕНКА Васіль [12(25).4.1904, Барысаў – 26.07.1984, Мінск] – літаратурны крытык.

Нарадзіўся ў Барысаве ў сям’і чыгуначніка. Да 1924 жыў разам з бацькамі, працаваў на чыгунцы і адначасова вучыўся ў вячэрняй школе. Скончыў Барысаўскі педагагічны тэхнікум і ў 1924–1926 працаваў у пачатковай сельскай школе. У 1929 скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне БДУ. У 1929–1932 вучыўся ў аспірантуры АН БССР. Навукова-даследчую і літаратурна-крытычную дзейнасць пачаў у 1930. Працаваў дэканам літаратурнага факультэта, дацэнтам на кафедры беларускай літаратуры Мінскага педінстытута, старшым навуковым супрацоўнікам Інстытута мовы і літаратуры АН БССР, дырэктарам Інстытута і па сумяшчальніцтву дацэнтам гэтага Інстытута. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны – у дзеючай арміі ў якасці спецыяльнага карэспандэнта армейскай газеты. Дэмабілізаваўся ў званні маёра і з 1946 па 1974 працаваў дырэктарам Інстытута літаратуры АН БССР, а ў 1974–1984 – навуковым супрацоўнікам-кансультантам Інстытута. Выступаць у друку пачаў з 1932. Галоўныя тэмы публікацый – даследаванне праблем тэорыі і гісторыі беларускай літаратуры, тэксталогіі, а таксама творчасць класікаў беларускай літаратуры Ф. Багушэвіча, В. Дуніна-Марцінкевіча, Цёткі, Я. Лучыны, Я. Купалы, Я. Коласа і інш. З’яўляецца складальнікам зборнікаў беларускай дакастрычніцкай прозы і паэзіі, аўтарам вучэбных дапаможнікаў і хрэстаматый па беларускай літаратуры для школьнікаў і студэнтаў.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Коласа. Член СП СССР з 1937.

# Рыгор Хацкевіч



ХАЦКЕВІЧ Рыгор [27.02.1911, в. Ратуцічы Барысаўскага раёна – 09.08.1979, в. Дакудава Крупскага раёна] – паэт, празаік.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. У 1930 скончыў Барысаўскі педтэхнікум, потым завочна – Мінскі педінстытут. Працоўны шлях пачаў настаўнікам у Чэрвеньскім раёне. У гэты ж час пачаў друкаваць свае вершы. У 1931–1933 – супрацоўнік чэрвеньскай раённай газеты, у 1933–1936 – настаўнік беларускай мовы і літаратуры ў Крупках. У 1936 абвінавачаны ў прыналежнасці да міфічнай «Усебеларускай нацдэмаўскай арганізацыі», рэпрэсаваны і сасланы на Поўнач. У 1946 вярнуўся на радзіму. Рэабілітаваны ў 1959. Настаўнічаў на Барысаўшчыне. Аўтар зборнікаў вершаў «Налівайся, колас» (1932) і «Бяроза на ўзлеску» (1977). Самыя значныя творы – аповесці «На золку» і «Хмара над лесам», прысвечаныя устанаўленню Савецкай улады на Барысаўшчыне.

# Уладзімір Дзямідчык



ДЗЯМІДЧЫК Уладзімір [1925, Барысаў – 05.09.1987, Душанбэ (Таджыкістан.)] – усходазнавец і лінгвіст.

У гады Вялікай Айчыннай вайны ў падлеткавым узросце трапіў у партызанскі атрад. У 1954 скончыў усходні факультэт Ленінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта і быў размеркаваны ў Душанбэ, дзе пачаў выкладаць у Таджыкскім дзяржаўным універсітэце. Потым на працягу 12-ці гадоў, не спыняючы выкладання, працаваў у Інстытуце ўсходазнаўства АН ТаджССР. Аўтар кніг «Учебник арабского языка» і «Очерк современной арабской литературы (Книга для чтения по современному арабскому языку)». У 1972 надрукавана яго кніга аб суданскай паэзіі 20 ст. – адзінае да апошняга часу ў Таджыкістане даследаванне суданскай літаратуры (у аснову кнігі пакладзена кандыдацкая дысертацыя Дзямідчыка, абароненая ў 1965). Быў аўтарам вершаў і прозы, аднак пры жыцці надрукаваны толькі яго пераклады арабскай паэзіі. З прозы ўбачылі свет «Лоцман с острова Арвад» і аповесць аб арабскім паэце 8 ст. Башары ібн Бурдзе. Але ж ім напісана цэлая серыя апавяданняў і вершаў, звязаных з яго дзіцячымі і юнацкімі гадамі, якія прайшлі ў Беларусі (некалькі з іх пасмяротна надрукаваны ў часопісе «Памир» у 1991–1992). Шмат у чым яго апавяданні блізкія да твораў В. Быкава. У 2004 у Маскве пасмяротна выйшла кніга У. Дзямідчыка «Мир чудес в арабской литературе XIII–XIV вв.».

# Леанід Рашкоўскі



РАШКОЎСКІ Леанід [09.01.1937, Барысаў – 31.05.1994, Барысаў] – паэт.

Нарадзіўся ў сям'і служачага. Скончыў СШ № 2 у Барысаве, вучыўся на заатэхнічным факультэце Віцебскага ветэрынарнага інстытута, але з-за цяжкай хваробы спыніў вучобу. У 1962 скончыў Барысаўскае медвучылішча, фельчарскае аддзяленне. У 1963 узначаліў літаб'яднанне «Бярэзіна» пры барысаўскай газеце «Камуністычная праца» («Адзінства»). У 1964 паступіў на журналісцкі факультэт БДУ, але па стану здароўя быў вымушаны спыніць вучобу. Першы верш надрукаваны ў барысаўскай газеце «За камунізм» («Адзінства») у 1955; першая публікацыя ў рэспубліканскай прэсе – у 1964. Аўтар зборнікаў вершаў «Пускай не умирают звезды» (1968), «Ливень» (1975), «Преодоление» (1979), «Откровение» (1987), а таксама некалькіх зборнікаў для дзяцей. У садружнасці з кампазітарам Я. Карпуцем напісаў шэраг песень. Член СП Беларусі з 1970.

# Міхась Стрыгалёў



СТРЫГАЛЁЎ Міхась [25.05.1938, в. Недайка Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобл. – 2006, Мінск] – паэт, перакладчык.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. У 1955 скончыў Недайскую сярэднюю школу. Працаваў у калгасе. У друку дэбютаваў у 1956 з вершамі на рускай мове, але з 1961 піша па-беларуску. У 1961 скончыў энэргетычны факультэт Беларускага політэхнічнага інстытута. У 1960 разам з А. Сербантовічам, будучым беларускім паэтам, арганізаваў студэнцкае літаб'яднанне «СЛОМ» пры шматтыражных газетах БДУ і БПІ. Пасля заканчэння інстытута накіраваны на Урал, дзе працаваў па набытай спецыяльнасці. У 1969 скончыў Літаратурны інстытут у Маскве. Працаваў кансультантам Пермскай абласной пісьменніцкай арганізацыі СП РСФСР, загадчыкам мясцовага Дома народнай творчасці, рэдактарам шматтыражкі. З 1978 да канца 80-х жыў у Барысаве. У 1980–1982 – сцэнарыст кінастудыі «Беларусьфільм». Кіраваў літаб'яднаннем «Бярэзіна» пры барысаўскай газеце «Камуністычная праца» («Адзінства»). Аўтар паэтычных зборнікаў: «Белая Русь» (1967), «Ростань» (1974), «Чырвоныя казармы» (1978), «Кола фартуны» (1981), «Дзевяты кардон» (1990), «Viqilia tertia: Третья стража» (рускамоўныя вершы за 40 год творчасці, 1999).

Член Саюза пісьменнікаў Беларусі (1988).

# Юры Станкевіч



СТАНКЕВІЧ Юры [сапр.: Харытановіч Георгій; 21.01.1945, Барысаў] – празаік.

Нарадзіўся ў сям'і агранома, які ў сталінскі час быў рэпрэсаваны. Вучыўся ў СШ № 9 у Барысаве. З 15 гадоў працаваў на Барысаўскай фабрыцы піяніна. Скончыў вячэрнюю школу рабочай моладзі, у 1969 – факультэт журналістыкі БДУ. З 1970 працаваў у барысаўскай газеце «Камуністычная праца» («Адзінства»), карэспандэнтам мясцовага радыё. У гэты ж час пачаў друкавацца ў рэспубліканскім друку – часопісах «Маладосць», «Бярозка», газеце «Літаратура і мастацтва». Піша апавяданні, вершы, публіцыстычныя артыкулы. У 1989 – супрацоўнік аддзела публіцыстыкі часопіса «Маладосць», потым загадчык аддзела крытыкі і мастацтва. Аўтар кніг прозы «Луп» (1989), «Анёлы на бальшаку» (1993), «Любіць ноч – права пацукоў» (2000), «Апладненне ёлупа» (2005), «Мільярд удараў» (2008), «П'яўка» (2010), «Шал» (2012), «Брамнік заўжды самотны» (2014), «Паўночны вецер для спелых пладоў» (2015), «Бесапатам» (2018), таксама некалькіх п'ес і кінасцэнарыяў.

Член СП Беларусі з 1992. Член Міжнароднага ПЭН-клуба.

# Васіль Гігевіч



ГІГЕВІЧ Васіль [03.01.1947, в. Жыцькава Барысаўскага раёна] – празаік.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і ветэрана Вялікай Айчыннай вайны. У 1964 скончыў Жыцькаўскую дзесяцігодку, у 1969 – Харкаўскі універсітэт (Украіна), дзе атрымаў тэхнічную і гуманітарную адукацыю. Пасля заканчэння універсітэта працаваў выкладчыкам фізікі ў Харкаўскай вобласці, праз год вярнуўся на Беларусь, дзе ў Ашмянах, у якасці карэспандэнта-радыёарганізатара працаваў пры раённай газеце «Красное знамя». З 1970 – інжынер Барысаўскага шклозавода. У 1979 пасля заканчэння Вышэйшых літаратурных курсаў у Маскве працаваў намеснікам галоўнага рэдактара аб'яднання «Летапіс» на кінастудыі «Беларусьфільм», пісаў сцэнарыі дакументальных фільмаў. З 1981 – старшы літаратурны супрацоўнік, а з 1989 – рэдактар аддзела прозы часопіса «Маладосць». У 1992–1995 супрацоўнік часопіса «Полымя». Друкавацца пачаў яшчэ на Украіне. У беларускім друку першае апавяданне змешчана ў часопісе «Полымя» ў 1972. Аутар празаічных кніг: «Спелыя яблыкі», «Калі ласка, скажы...», «Жыціва», «Астравы на далёкіх азёрах», «Доказ ад процілеглага», «Марсіянскае падарожжа», «Кентаўр», «Карабель» і інш.

Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі. Член СП Беларусі з 1977.

# Давід Шульман



ШУЛЬМАН Давід [1948, Барысаў] – пісьменнік.

Скончыў факультэт энэргетыкі Беларускага політэхнічнага інстытута, працаваў па спецыяльнасці. Яго творы на рускай і беларускай мовах друкаваліся ў часопісах «Полымя», «Маладосць» і інш. З 1991 жыве у Ізраілі, дзе друкуецца ў рускамоўных цэнтральных і мясцовых газетах і часопісах. Аўтар кніг «Дзе ўзяць крыху шчасця» (2005), «Когда мы ездили за носками» (2004), «В тёплом городе Эйлате» (2008), «Баскетболистка с улицы Жданова» (2013), «З вялікай літары “Б”» (2015), «Особое женское состояние» (2016), «Жанчына валіць з ног, жанчына ставіць на ногі» (2017), «Не по правилас сыграли» (2018), «Краткие истории нашего времени» (2019).

Член Саюза беларускіх пісьменнікаў і Беларускага ПЭН-цэнтра.

# Аляксандр Быкаў



БЫКАЎ Аляксандр [07.09.1954, Барысаў] – паэт.

Сярэднюю адукацыю атрымаў у Барысаве (СШ № 11). Пасля службы ў арміі працаваў на Барысаўскім заводзе аўтатрактарнага электраабсталявання і вучыўся завочна на факультэце журналістыкі БДУ. Пасля заканчэння ўніверсітэта ў 1985 працаваў у шматтыражнай газеце «Трыбуна», у барысаўскай аб'яднанай газеце «Камуністычная праца» (цяпер «Адзінства») і ўваходзіў у яе літаб'яднанне «Бярэзіна». Друкаваўся ў газетах «Звязда», «Мінская праўда», «Літаратура і мастацтва», у часопісе «Вожык». З 1985 жыве ў Мядзеле, працаваў загадчыкам адзела эканомікі і рыначных адносін раённай газеты «Нарачанская зара». Яго вершы надрукаваны ў літаратурна-мастацкім выданні «Дзень паэзіі–2005». Пераможца Рэспубліканскага конкурсу за лепшы літаратурны твор 2013 года ў галіне паэзіі «Залаты купідон». Аўтар зборнікаў паэзіі: «Кветка папараць» (2005), «Пад небам буслiным» (2007), «За межы круга» (2013), «І тым не менш...» (2016), «Пегас на сотках» (2018), «Барысаўскі тракт» (2019), а таксама прозы – «Бабуліны макі» (2015).

Член Саюза пісьменнікаў Беларусі з 2009.

# Алесь Камоцкі



КАМОЦКІ Алесь [09.06.1958, Барысаў] – паэт і музыкант.

Выпускнік СШ № 1 Барысава (1975). У 1975–1976 вучыўся ў музычным вучылішчы г. Маладзечна па класе кларнета. У 1977–1979 служыў у войску. У 1986 скончыў аддзяленне філасофіі гістарычнага факультэта БДУ. У сярэдзіне 1980-х быў саксафаністам у музычна-інструментальнай групе «Близнецы» пазней – «Зартипо». Пэўны час працаваў у тэатры «Дзе Я?». У другой палове 1980-х пачаткаў выступаць, як выканавец уласных беларускіх песень і песень на вершы вядомых паэтаў. Пад канец 1990-х стаў запісваць уласныя творы ў хатніх умовах, абсталяваў для гэтага кампакт-студыю. У 2006 годзе ўпершыню ажыццявіў запіс уласных песень разам з інструментальнай групай. Вядзе актыўную творчую дзейнасць.

Аўтар зборнікаў вершаў «Спроба ісці па расе» (1997), «Наспадзяванне» (2004), «Глыбіня дажджу» (2007), «48» (2007), альбомаў песень «Дым», «Дом», «Дах», «З бацькоўскай кружэлкі», «9» і інш. Вядомы як выканаўца ўласных песень.

Лаўрэат шматлікіх фестываляў аўтарскай песні.

# Алена Брава



БРАВА Алена [18.08.1966, Барысаў] – пісьменніца, журналіст.

Скончыла з залатым медалём СШ № 15 у Барысаве, потым, у 1989, факультэт журналістыкі БДУ. Некаторы час разам з мужам і дачкой жыла на Кубе. У 1994–1998 узначальвала рэдакцыю барысаўскай грамадска-палітычнай газеты «Адзінства», з 1999 – адказны сакратар рэдакцыі, потым намеснік галоўнага рэдактара. З 2019 года – рэдактар часопіса «Алеся». Пісаць пачала рана. Друкавалася ў літаратурна-мастацкіх часопісах Беларусі «Маладосць», «Полымя», «Дзеяслоў», «Нёман», Расіі («Сибирские огни»), рускага замежжа «Новый Берег» (Капенгаген). Творы выходзілі ў анталогіях «Апавяданне–2005», «І зоркі над Бярэзінай-ракой» (2008), «У храме зямнога кахання» (2009), «Самая чароўная кветка» (2010), «За мостом моего детства» (2011). Аўтар зборніка вершаў «На глубине корней» (2002), зборніка аповесцей і апавяданняў «Каменданцкі час для ластавак» (2004), аповесцей «Імя Ценю – Святло» (2012), «Рай даўно перанаселены» (2012), «Представление в чёрном театре» (2012), «Дараванне / Прощение / Vergebung» (2013), рамана «Менада и ее сатыры» (2013), рамана «Садомская яблыня» (2018). Лаурэат прэміі «Гліняны Вялес» (2004). Кніга «Каменданцкі час для ластавак» была названа лепшай кнігай 2004 г. і адзначана прэміяй «Гліняны Вялес» Лаўрэат Міжнароднай літаратурнай прэміі «Silver Bullet» («Сярэбраная куля») выдавецтва «Franc-Tireur USA» (ЗША, 2013). Кнігі ўваходзілі ў лонг і шорт-ліст (2013–2014) літаратурнай прэміі ім. Ежы Гедройца (Беларусь). За аповесць «Дараванне» аўтар узнагароджана расійскай літаратурнай прэміяй і залатым медалём імя Канстанціна Сіманава. Уладальніца іншых літаратурных узнагарод і прэмій.

Член Саюза пісьменнікаў Беларусі з 2006. Член Беларускага саюза журналістаў.

# Сяргей Клімковіч



КЛІМКОВІЧ Сяргей [28.08.1973, в. Вялікая Ухалода Барысаўскага раёна] – празаік, ваенны журналіст.

Дваюрадны ўнук Міхася Клімковіча, аўтара тэксту гімна Беларускай ССР. Піша з 13 гадоў. Яго першай публікацыяй стала фантастычнае апавяданне «Не сілай, дык хітрасцю», надрукаванае ў 1997 у газеце «Чырвоная змена». Працаваў на заводзе агрэгатаў, спецыяльным карэспандэнтам у часопісе «Армія». У 2005–2011 вучыўся ў Маскоўскім літаратурным інстытуце ім. А. М. Горкага. Пад канец 2006 года вёў на Першым беларускім нацыянальным радыё сваю літаратурна-музычную праграму «Музыка і пачуцці». У 2009–2013 працаваў спецыяльным карэспандэнтам Вайсковага інфармацыйнага агенцтва Узброеных Сіл Беларусі «Ваяр». Аўтар шматлікіх апавяданняў, якія публікаваліся ў часопісах «Нёман», «Ваяр Расіі» і інш. Спачатку пісаў дэтэктывы, а да дзіцячай аўдыторі звярнуўся ў 2014 г. Літаратурныя эскізы Сяргея Клімковіча «Зимние окна» і «Родом из детства» прагучалі на Радыё «ВЕРА» ўвосень 2017 года. Агучыў мініяцюры вядомы расійскі акцёр Антон Макарскі. Піша «гарадскі раман», дэтэктывы, меладрамы, прозу для дзяцей. Аўтар раманаў «Одиночество в раю» (2003), «Танцует осень» (2003), «Три строки о радости, три строки о грусти» (2006), «Забвение сердец» (2008), «Секрет Полины» (2011), «Кому как повезет» (2013) і інш. Аўтар кніг для дзяцей і падлеткаў . Лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Рэспублікі Беларусь 2016 года ў намінацыі «Лепшы дэбют» за цыкл дзіцячых кніг «Тайна квартиры № 8», дыпламант літаратурнай прэміі «Бібліязважанне – 2017», дыпламант 2-га Міжнароднага літаратурнага конкурсу «Сузор'е духоўнасці» – 2018. Уладальнік іншых премій і ўзнагарод.

Член Саюза пісьменнікаў Беларусі (з 2005) і Саюза пісьменнікаў Расіі (2016).

# Марына Помаз



ПОМАЗ-ЛАЙКОВА Марына [26.01.1975, Барысаў] – паэтэса, бард.

Скочыла БДПУ імя М. Танка (1998). Па прафесіі псіхолаг. Працавала ў розных установах адукацыі. Узначальвала дзіцячую тэатральную студыю. Цяпер працуе ў ДУДА «Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Барысаўскага раёна». З'яўляецца арганізатарам і кіраўніком літаратурнага аб'яднання «Октава». Друкавалась у часопісах «Нёман», «Немига литературная», «Наш современник», а таксама ў двухтомніку «Поэзия русского слова: антология современной русскоязычной поэзии Беларуси» (2019). Піша песні, займаецца жывапісам, кніжнай ілюстрацыяй, іканапісам. Узначальвае ансамбль сярэднявечнай музыкі «Bip». Лаўрэат шэрага беларускіх фестываляў аўтарскай песні ў Беларусі, Усерасійскага конкурсу «Новые песни детства» (2013). Аўтар зборнікаў «Дымчатые кони» (2010), «Сиреневое солнце» (2012).

# Янка Лайкоў




ЛАЙКОЎ Янка [10.09.1979, в. Мётча Барысаўскага раёна] – паэт, крытык, журналіст .

Нарадзіўся ў сям'і настаўнікаў. Скончыў Мётчанскую сярэднюю школу, вучыўся на беларускім аддзяленні факультэта філалогіі БДУ, потым на факультэце традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва Беларускага дзяржуніверсітэта культуры і мастацтва. Працаваў у газеце «Літаратура і мастацтва» ў аддзеле паэзіі, аддзеле крытыкі часопіса «Маладосць». Вершы пачаў пісаць у школьным узросце. Друкаваўся ў барысаўскіх газетах, часопісе «Першацвет», у зборніку «Верш на свабоду», у літаратурна-мастацкім выданні «Дзень паэзіі – 2005». Працуе на аўтазаправачнай станцыі і рэдактарам аддзела прозы штотыднёвіка «Літаратура і Мастацтва». Аўтар паэтычных кніг «Акраец паветра» (1998), «Логіка пасткі» (2000), «Вогнепаклоннік» (2003).

З 2001 па 2005 год з'яўляўся сябрам Саюза беларускіх пісьменнікаў, з 2005 года па цяперашні час уваходзіць у шэрагі Саюза пісьменнікаў Беларусі.

# Тацццяна Заміроўская



ЗАМІРОЎСКАЯ Таццяна [11.04.1980, Барысаў] – літаратар, журналіст.

З 2014 жыве і працуе ў Нью-Ёрку. Скончыла факультэт журналістыкі БДУ (2002), аспірантуру пры ім (2006) і магістратуру вытанчаных мастацтваў Бард-Коледжа (Нью-Ёрк). Займалася музычнай журналістыкай. Выступаць у прэсе пачала ў 1997 – пісала нататкі, артыкулы, рэпартажы, рэцэнзіі, інтэрв’ю для «Музыкальной газеты» і часопісу «НОТ-7». У 1998–2001 – супрацоўнік газеты «Молодёжный проспект». Ад 2002 да восені 2003 працавала рэдактарам часопіса «Джаз-квадрат». У 2004–2006 – музычны аглядальнік штотыднёвіка «Развлечения и отдых», а з 2005 – музычны аглядальнік «Белгазеты». З’яўлялася калумністам часопіса «Большой», супрацоўнічала з шэрагам беларускіх, расійскіх і англамоўных медыя. За інтэрнет-дзённік намінаваўся ў 2006 на Прэмию Рыкава. У 2020 годзе трапіла ў доўгі спіс адной з найбуйнейшых літаратурных прэмій Расіі «Нацыянальны бэстсэлер» і прэміі «Новая словесность» («НОС») з кнігай «Земля случайных чисел». Кароткія апавяданні друкаваліся ў зборніках сучаснай прозы серыі «Фрам» выдавецтва «Амфора» («78», «Уксус и крокодилы», «Русские инородные сказки-5») і ў зборніку «ЖЖOut» (2007). Сталы ўдзельнік зборнікаў прозы серыі «Textus» (Макс Фрай, АСТ). Намінант прэміі Астаф’ева, пераможца прэміі Горчава (2018), уладальнік стыпендый ад Macdowell Colony і Virginia Center For The Creative Arts. Аўтар зборнікаў апавяданняў «Жизнь без шума и боли» (2010), «Воробьиная река» (2015), «Земля случайных чисел» (2019), рамана «Смерти.net» (2021), удзельніца шэрагу літаратурных праектаў.

# Людміла Клачко



КЛАЧКО Людміла [21.06.1990, Барысаў] – паэтэса, псіхолаг .

У 2012 г. скончыла Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (факультэт «Выдавецкая справа і паліграфія»), потым Маскоўскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт (па спецыяльнасці «практычны псіхолаг»). Публікавалася ў часопісах «Нёман», «Новая Немига Литературная», «Новый Современник» і інш. Суаўтар калектыўных зборнікаў «Маладзік» (2013), «Мы рождены для вдохновенья» (2013), паэтычнага альманаха «Образ» аднайменнага паэтычнага выдавецтва (2013). Аўтар паэтычных зборнікаў «На пару слов» (2013), «Чертополох» (2016), «Маленький сборник стихов» (2018). Пераможца Мінскага гарадскога літаратурнага конкурсу, прысвечанага 130-годдзю з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа ў намінацыі «паэзія» (узроставая катэгорыя да 25 гадоў), уладальніца Дыплома 2-й ступені X Міжвузаўскага літаратурнага форума ім. Н. С. Гумілёва «Осиянное слово» (2013), лаўрэат прэміі Саюза пісьменнікаў Беларусі і X Усерасійскага адкрытага фестывалю маладых паэтаў «Мцыри» (2014) і інш. Лонг-ліст конкурсу «Русская премия» (2014), двойчы лонг-ліст літаратурнай прэміі «Белла» (2015, 2016).

Член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

# Кірыл Стаселька



СТАСЕЛЬКА Кірыл [25.07.1990, Барысаў] – пісьменнік, спецыяліст у вобласці сацыялогіі.

У 2013 г. скончыў факультэт філасофіі і сацыялогіі БДУ. У 2013–2014 гг. вучыўся ў магістратуры Інстытута падрыхтоўкі навуковых кадраў НАН Беларусі. У 2014 г. – малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі, адначасова – выкладчык БДУ. З 2015 г. – дырэктар Агенцтва інфармацыйных тэхналогій. У 2017 г. скончыў аспірантуру Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі. З 2017 г. – навуковы супрацоўнік гэтага інстытута. Кіраўнік інтэрнэт-часопіса infographer.by, каардынатар праекта «Народны журналіст». Публікавацца пачаў з 2007 г. Аўтар кніг: «Дзіцячы маніфест» (2015), «Marginalis» (2016, 2018), «Дзевяць жыццяў Віта Морэ» (2019), «Пімкі» (2020).


Яркія акцёры і акцёркі, рэжысёры, музыкі, спевакі, танцавальныя гурты.
Паглядзіце, колькі талентаў нарадзіла Барысаўская зямля.

АКТРИСА

# ДЕНИСОВА МАРИНА







**Родилась в 1983 году в г. Нойштрелитц (Германия). Вскоре после ее рождения семья переехала в Беларусь. Денисовы остановились в Борисове. Здесь и прошло детство Марины. В 2004 году окончила Белорусскую государственную академию искусств, специальность - актриса театра и кино. В 2003-2004 годах - актриса Национального академического драматического театра им. Горького (Минск). В 2004-2015 годах - актриса драматического Театра белорусской армии.**

АКТРИСА

# БУРМИСТРОВА НАТАЛЬЯ







**Советская, грузинская актриса театра и кино. Народная артистка СССР (1972). Родилась в 1918 году в Борисове в семье заслуженного артиста Чувашской АССР. Работала в Областном русском драматическом театре имени Николая Погодина, Горьковском театре драмы и других. Участница войны. С 1941 года была санитаркой санитарного поезда. Затем — актриса передвижного фронтового театра. С 1948 года — ведущая актриса Тбилисского русского драматического театра им. А. Грибоедова.**

АКТЕР

# ВЕРГУНОВ АЛЕКСАНДР







Актер, режиссер, сценарист, писатель. Родился в 1956 году в Борисове. В 1978 году окончил Белорусский государственный театрально-художественный институт по специальности «актёр драматического театра и кино» (курс заслуженного деятеля искусств Республики Беларусь В.А.Маланкина, Л.А.Монаковой). Работал в Минском государственном театре кукол. С 2011 года актер Национального академического драматического театра им. М.Горького.

АКТРИСА

# МЕЛЕХОВА ЯНИНА







**Родилась В 1985 году в Борисове. В 2006 году окончила театральный факультет Белорусской государственной академии искусств по специальности "актёр театра и кино". В 2006-2007 гг. работала в "Театре на Покровке". С 2008 года - актриса Детского музыкального театра "Экспромт". С 2009 года - педагог по хореографии и актёрскому мастерству в студии эстетического воспитания при театре "Экспромт". С 2018 года -актриса "Театра Луны". Член Гильдии киноактёров России.**

АКТРИСА

# ВИРОЛАЙНЕН ЛЮБОВЬ







**Родилась в 1941 году в Борисове, Белорусская ССР. Заслуженная артистка РСФСР (25.02.1980). Окончила студию при Ленинградском Большом драматическом театре им. М. Горького (1965) и стала актрисой этого театра. С 1969 года — актриса Ленконцерта. С 1972 года по 1990 — актриса киностудии «Ленфильм». В 2002 году, после десятилетнего перерыва, Любовь Виролайнен вновь вернулась на экраны (телесериал "Время любить") И сэтого времени снимается регулярно.**

АКТРИСА

# ПУХОВАЯ ОЛЕСЯ







**Родилась в 1975 году в городе Борисове. Окончила школу № 2 с театрально-хореографическим уклоном. В 1993 году поступила в Белорусссский университет культуры и искусств на факультет режиссуры массовых праздников и обрядов, через два года перевелась на актерский факультет и окончила университет как «Артист эстрады разговорного жанра». После окончания университета играла в Современном художественном театре. С 2005 года актриса Театра-студии киноактера.**

РЕЖИССЕР

# ГАЙДУК СТАНИСЛАВ



**Советский и белорусский режиссер, сценарист. Детство и школьные годы прошли в деревне Чернявка Борисовского района.**

**1975 — Алёхин -человек «дорожный»**
**1986 — Сержант**
**1995 — Симеон Полоцкий**
**1998 — Белорусское кино**
**2000 — Орхидеи Беларуси**
**2004 — История одной фотографии**
**2008 — Белорусский крест**
**2009 — Слуцк**
**2009 — Я ехала домой**

ИСПОЛНИТЕЛЬНИЦА НАРОДНЫХ ПЕСЕН

# АДАМЕЙКО МАРИЯ



**Солистка Государственного народного хора им. Г.Титовича, заслуженная артистка Белорусской ССР. В хоре сложился известный вокальный дует М. Адамейко и Г. Авдеенко. Не раз выступала на лучших сценах многих республик бывшего Союза и за рубежом. За свой талант она была отмечена медалями и дипломами.**

АКТЕР

# КУРГАН ИЛЬЯ



Родился в 1926 году в Борисове. В 1945 году поступил в Минский театральный институт на актёрский факультет. Был диктором Белорусского радио с 1949 по 1990 год. Работал литературным консультантом в Купаловском театре и Республиканском театре белорусской драматургии, профессором кафедры сценической речи в Белорусской академии искусств и Минском университете культуры и искусств. Являлся почётным членом Белорусского Театрального Общества.
Умер в 2019 году.

РЕЖИССЕР

# СТЕЦКИЙ КАЗИМИР



**Родился в Борисове в 1905 году. Учился в Государственном институте театрального искусства в Киеве. С 1939 назначен художественным руководителем и актёром Лепельского колхозно-совхозного театра. В период с 1944-1946-художественный руководитель Полесского ансамбля песни и танца. С 1947-заведующий Республиканского дома народного творчества. С 1958-1977-режиссер Белорусского телевидения, где работал в жанре общественно-политического телевещания. Создал много короткометражных фильмов, репортажей, телеочерков.**

РЕЖИССЕР

# БУЙКО ВЛАДИМИР



С 1986 года руководил театром "Видарис". С его приходом коллектив театра получил свою постоянную сцену и театральный зал в Городском дворце культуры им. М. Горького. В. Буйко поставил на сцене театра около 30 спектаклей, среди который "Пифагор", "След волкодава", "Смерть доктора Фауста". В 1987 году за спектакль "Диктатура сомнения" коллектив театра получил Диплом Союза писателей СССР. При нем театр гастролировал и участвовал в Международных театральных фестивалях любительских спектакях (Швеция, Грузия).

МУЗЫКАЛЬНЫЙ ДУЭТ

# АЛЕКСАНДРА КОНСТАНТИН



Белорусский музыкальный дуэт, представители Белоруссии на конкурсе песни Евровидение 2004. Коллектив создан в 1998 году в Борисове. Работают в стиле модерн-фолк. В 2000 году стали лауреатами телевизионного конкурса «Зорная ростань». В 2001 году был выпущен альбом «За ліхімі за маразамі». С того момента началась звёздная карьера дуэта: группа выступает в России, Белоруссии, Польше и др. странах. Участвовали в международных фестивалях: «Славянский базар-2002», «Ethnosfera-2002» (Польша), «Астана-2003» (Казахстан), «Palangos Gaida-2005» (Литва), «Discovery-2006» (Болгария).

ОПЕРНЫЙ ПЕВЕЦ

# ПЕТРОВ ПАВЕЛ



Певец жил и учился в Борисове. В 2011 г. поступил в Белорусскую государственную академию музыки (класс народного артиста Беларуси, профессора П.Ридигера). Павел Петров является солистом Национального академического Большого театра оперы и балета Республики Беларуси с 2012 года. В репертуаре молодого певца – партии Ленского (оп. «Евгений Онегин»), Альфреда («Травиата»), Рудольфа («Богема»). ПобедителЬ специального приза за лучшее исполнение всемерного конкурса оперных певцов “Опералия” 2018.

НАРОДНЫЙ АНСАМБЛЬ НАРОДНЫХ ИНСТРУМЕНТОВ

# КАРАЛІ



Коллектив создан в 2004 году. Руководитель коллектива – Елена Николаевна Лобовикова. Звание «народный» присвоено в 2006 году. Звание «Заслуженный любительский коллектив Республики Беларусь» присвоено в 2018 году. Ансамбль «Каралі» – неоднократный участник культурных знаковых мероприятий, конкурсов, фестивалей, о чем свидетельствуют многочисленные дипломы и награды. Артистами творческого коллектива ведется активная концертная и просветительская деятельность.

З прадстаўленымі кнігамі і біяграфіямі выбітных асоб можна пазнаёміцца ў Барысаўскай бібліятэцы.

Віртуальная прэзентацыя падрыхтавана на аснове кніжна-ілюстратыўных выставак супрацоўнікаў цэнтральнай бібліятэкі.


Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева
ЗАПРАШАЕ!